УДК 347.77

# ПСІХАЛАГІЧНЫЯ РЫСЫ АХВЯР КІБЕРЗЛАЧЫНСТВАЎ

***М. Н. Сулімава***
*курсант 3 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік:* ***С. В. Венідзіктаў****,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Інтэрнэт-злачынства (кіберзлачынства) — гэта акт сацыяльнай дэвіяцыі з мэтай нанясення эканамічнай, палітычнай, маральнай, ідэалагічнай, культурнай і іншых відаў шкоды індывіду, арганізацыі ці дзяржаве з дапамогай любога тэхнічнага сродку з доступам у Інтэрнэт [1]. Асабліва высокай ступенню грамадскай небяспекі характарызуецца распаўсюджванне праз Інтэрнэт наркатычных сродкаў, ажыццяўленне дзеянняў сэксуальнага характару ў дачыненні да дзяцей і падлеткаў, выкраданне канфідэнцыяльных даных.

Штогадова колькасць людзей, якія сталі ахвярамі ў віртуальнай прасторы, павялічваецца. У такой сітуацыі мы можам весці гаворку аб наяўнасці ў структуры асобы пэўных псіхалагічных рыс, якія вызначаюць віктымнасць у сферы інтэрнэт-злачыннасці.

Ахвярамі злачынстваў сэксуальнай скіраванасці часцей за ўсё становяцца дзяўчаты, якія атрымліваюць недастаткова ўвагі, выхоўваюцца ў няпоўных сем’ях, маюць псіхалагічныя комплексы адносна сваёй знешнасці, жадаюць як мага раней стаць самастойнымі.

У адносінах да ахвяр крадзяжоў персанальных дадзеных і фінансавай інфармацыі агульнымі псіхалагічнымі рысамі з’яўляюцца інфантыльнасць, бестурботнасць, безадказнасць. Злачынцы падбіраюць прымітыўныя лічбавыя камбінацыі і, атрымаўшы доступ у тым ліку да сістэмы інтэрнэт-банкінгу, спусташаюць рахункі ўладальнікаў [2]. Ахвяры такіх дзеянняў, як правіла, адрозніваюцца нізкім узроўнем фінансавай і камп’ютарнай граматнасці, праяўляюць бестурботнасць у паводзінах.

У апошні час усё больш распаўсюджанымі становяцца выпадкі махлярстваў пры дапамозе сістэм грашовых пераводаў. У псіхалагічным партрэце ахвяр падобных злачынстваў пераважаюць празмерная даверлівасць, схільнасць да імпульсіўных дзеянняў, адсутнасць навыкаў крытычнага мыслення.

Рост колькасці злачынстваў, якія здзяйсняюцца ў Сеціве, а таксама схільнасць грамадзян стаць ахвярай новых відаў інтэрнэт-правапарушэнняў выклікае неабходнасць у процідзеянні такім з’явам з боку дзяржаўных органаў, грамадзянскай супольнасці. Важная роля ў фарміраванні псіхалагічнай устойлівасці да патэнцыйных дзеянняў кіберзлачынцаў адводзіцца сістэме адукацыі, якая сваю дзейнасць павінна ажыццяўляць ва ўзаемадзеянні з органамі ўнутраных спраў і з сем’ямі, што выхоўваюць непаўнагадовых дзяцей.

---

1. Кузнецова Е. В. Информационное пространство сети Интернет в системе детерминант преступности несовершеннолетних // Вестн. Москов. ун-та МВД Российской Федерации. 2015. № 9. С. 71–74. Вернуться к статье

2. Самошин А. В., Горовой В. В. Особенности предупреждения распространения экстремистских материалов в молодежной среде по глобальной сети Интернет // Труды Акад. управления МВД России. 2016. № 3. С. 61–65. Вернуться к статье